**УДК 27-277:378“18/19”**

**БІБЛЕЙСКІЯ ШТУДЫІ Ў КІЕЎСКАЙ ДУХОЎНАЙ АКАДЭМІІ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ: ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ**

***канд. філас. навук, дац. С.І. ГАЛАВАШЧАНКА***
***(Нацыянальны ўніверсітэт “Кіева-Магілянская акадэмія”, Кіеў, Украіна)***

*Дэманструецца вынік шматгадовай даследчай працы аўтара, якая знайшла адлюстраванне ў шэрагу навуковых артыкулаў і ў манаграфіі. Упершыню ва ўкраінскай навуцы здзейснена гістарычная і тэарэтычная рэканструкцыя біблейскіх штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя. Дадзены феномен прадстаўлены і прааналізаваны як цэласная сістэма даследчай, выкладчыцкай, багаслоўска-апалагетычнай і рэлігійна-асветніцкай дзейнасці. Асабліва падкрэсліваецца матыў персанальнай рэпрэзентацыі даследчых і дыдактычных практык у сферы бібліязнаўства, даследаванні якіх сталі магчымымі шляхам выкарыстання біяграфічнага і прасапаграфічнага аналізу.*

**Уводзіны.** Актуальнай задачай у сферы рэлігійных і багаслоўскіх штудый ва Украіне з’яўляецца вывучэнне станаўлення і развіцця айчыннай традыцыі біблейскіх даследаванняў як у сувязі з еўрапейскім кантэкстам, так і з улікам лакальнай культурнай і канфесійнай спецыфікі. Цэлая прафесійная супольнасць, што займалася вывучэннем Бібліі, яе выкладаннем і папулярызацыяй, паўстала ў Кіеўскай духоўнай акадэміі на працягу XIX – пачатку XX стагоддзя.

Кіеўскае бібліязнаўства ўпершыню стала аб’ектам аналізу ў другой палове XIX – на пачатку XX стагоддзя. У прыватнасці, пра гэта сведчаць нарысы па гісторыі вывучэння і выкарыстання Бібліі ў айчыннай праваслаўнай культуры; працы па гісторыі Кіеўскай духоўнай акадэміі; працы, прысвечаныя праблемам развіцця бібліязнаўства ў Расійскай імперыі, эвалюцыі праваслаўнага багаслоўя ў цэлым [13; 27; 28; 31; 35; 37; 38; 55; 62; 64; 66]. Першыя ацэнкі персанальнага ўнёску вядучых даследчыкаў Бібліі з Кіеўскай духоўнай акадэміі змяшчаліся ва ўспамінах, юбілейных і памятных выступах, некралогах, напісаных іх вучнямі і калегамі [гл., напр.: 10; 12; 61].

Перапынак у развіцці кіеўскай багаслоўскай культуры і адсутнасць непасрэдных стымулаў да яе навуковага вывучэння прывялі да таго, што бібліязнаўчая спадчына Кіеўскай духоўнай акадэміі была цалкам забытая ў свецкай савецкай і ранняй постсавецкай гістарыяграфіі. Вывучэнне гісторыі праваслаўнай біблейскай навукі было адноўлена царкоўнымі аўтарамі ў сярэдзіне 1980-х гадоў на хвалі савецкай лібералізацыі. Але яны звярталі ўвагу перадусім на Маскоўскую і Санкт-Пецярбургскую духоўныя акадэміі. Працы з Кіеўскай духоўнай акадэміі разглядаліся да пачатку 2000-х гадоў толькі як складовая частка “дарэвалюцыйнага” праваслаўнага бібліязнаўства [1; 29; 36; 60]. “Агульнарасійскі” погляд, адсутнасць арыгінальнасці, празмерная абстрактнасць або фрагментарнасць былі агульнымі хібамі такіх даследаванняў.

Толькі ў 2000-х гадах пачалося параўнальна рэгулярнае вывучэнне бібліязнаўчай спадчыны Кіеўскай духоўнай акадэміі, перадусім айчыннымі даследчыкамі. Такім чынам, праявілася імкненне да больш глыбокага даследавання гісторыі рэлігійнага і багаслоўскага развіцця ва Украіне. Былі здзейсненыя першыя крокі ў даследаванні прац некаторых кіеўскіх прафесароў XIX – пачатку XX стагоддзя [гл., напр.: 30; 33; 63; 65]. Гэтыя пошукі былі пераважна ўпісаныя ў больш шырокі гісторыка-царкоўны, гісторыка-філасофскі і гісторыка-багаслоўскі кантэкст або ў кантэкст гісторыі ўсходазнаўчых студый ва Украіне. Вывучэнне інстытуцыйных асноў біблейскіх штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі, а тым больш бібліязнаўчых прац выхаванцаў або выкладчыкаў Акадэміі, заставалася эпізадычным.

Нашыя намаганні на працягу апошняга дзесяцігоддзя былі накіраваны на адраджэнне гэтага напрамку навуковых даследаванняў як для свецкай, так і для царкоўнай навукі. У выніку чаго зроблена наступнае:

- ажыццёўлены комплексны аналіз свецкай і царкоўнай гістарыяграфіі пытання; вызначаны тэарэтычныя прынцыпы даследавання тэмы;
- сфарміравана крынічная база даследавання на аснове гістарычных дакументаў і першакрыніц, часта малавядомых;
- выяўлены гістарычныя, культурныя, рэлігійныя ўмовы і фактары станаўлення біблейскіх штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя;
- рэканструявана сістэма біблейскай адукацыі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі ўказанага перыяду – структура, змест, методыка, дыдактыка;
- вызначаны праблематыка, прадметна-тэматычная структура і жанравыя асаблівасці біблейскіх даследаванняў у Кіеўскай духоўнай акадэміі; выяўлены канкрэтныя навукова значныя вынікі;
- асэнсаваны досвед прафесараў і выхаванцаў Кіеўскай духоўнай акадэміі ў сферы папулярнага выкарыстання біблейскіх ведаў у катэхітычных, асветніцкіх, місіянерскіх практыках;

- вызначаны змест і спецыфіка біблейскіх штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі ў кантэксце задач праваслаўнага багаслоўя і царкоўнай адміністрацыі;
- высветлены асаблівасці сувязяў і ўзаемадзеянняў даследчыцкіх практык кіеўскіх навукоўцаў з еўрапейскай і сусветнай біблейскай навукай;
- выяўлены месца і роля Кіеўскай духоўнай акадэміі ў развіцці праваслаўнага бібліязнаўства ва Украіне.

Вызначаючы метадалогію даследавання, мы зыходзілі з устаноўкі на вывучэнне традыцыі біблейскіх штудый як гісторыі засваення сакральнага тэксту, дамінантнага ў айчыннай рэлігійнай культуры. Таму аналіз эвалюцыі біблязнаўчай традыцыі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі ў межах храналагічна працяглага адрэзку часу вызначыў выкарыстанне гісторыка-генетычнага і гісторыка-тыпалагічнага метадаў, а даследаванне яе арганізацыі і структуры ажыццёўлена з дапамогай структурна-функцыянальнага аналізу. Культурна-асветніцкі і рэлігійны кантэксты, ідэйныя і інстытуцыйныя фактары фарміравання бібліязнаўчага дыскурсу ў Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя вывучаліся на аснове культуралагічнага, кантэкстуальнага і кампаратывісцкага падыходаў. Вывучэнне гістарычных крыніц, іх мовы, тэрміналогіі, наратываў адбывалася шляхам выкарыстання тэкстуальнага, лексіка-тэрміналагічнага, фармальна-жанравага, сюжэтна-кампазіцыйнага, праблемна-зместавага і кантэнт-аналізу. Герменеўтычны і ідэйна-канцэптуальны аналіз навуковай і багаслоўскай творчасці кіеўскіх даследчыкаў Бібліі даў магчымасць выявіць іх ідэйныя, светапоглядныя арыентыры, тэарэтычныя асновы і навукова значныя вынікі іх даследаванняў.

У выніку сфарміраваны погляд на біблейскія штудыі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя як на адлюстраванне тагачасных навуковых, багаслоўскіх, маральна-этычных, сацыяльных, дыдактычных уяўленняў. Дадзены феномен, акрамя таго, сфарміраваўся як інстытуцыяналізаваная супольнасць, якая грунтавалася на сістэме асветніцкіх, даследчыцкіх і выхаваўчых практык. Надзвычай важна таксама тое, што біблейская навука ў Кіеўскай духоўнай акадэміі паўстала не толькі як феномен багаслоўскай і гуманітарнай культуры таго часу, але і як праява персанальнай творчасці яе прадстаўнікоў. Адпаведна, прымяненне элементаў прасапаграфічнага аналізу абумовіла акцэнт на спецыфічных для соцыуму, эпохі і канфесій спосабах вытворчасці і трансляцыі бібліязнаўчых ведаў, на іх выяўленні ў досведзе пэўнай прафесійнай групы і яе асобных прадстаўнікоў.

***Ad fontes*: значэнне стараўкраінскіх матываў рэлігійна-нацыянальнага самавызначэння і ўплывы кіева-магілянскай традыцыі.** Перадумовы станаўлення традыцыі біблейскіх штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі сфарміраваліся на працягу XVI –XVIII стагоддзяў. Айчынная традыцыя вывучэння Бібліі паўстала ў сувязі з агульнаеўрапейскім матывам рэлігійна-нацыянальнага самавызначэння. Найбольш вядомыя ва ўкраінскай гісторыі біблейскія рукапісы і друкаваныя выданні XVI стагоддзя (Астрожская Біблія, Перасопніцкае Евангелле, Крэхоўскі Апостал) адлюстроўвалі зацікаўленасць культурнай эліты ў асвеце і духоўным росце суайчыннікаў. Біблейскі тэкст і каментары да яго святых айцоў сталі асновай багаслоўска-катэхітычных, літургічных, гамілетычных, маралістычных і эклезіястычных твораў стараўкраінскіх кніжнікаў. Літургічнае засваенне Бібліі ў XVI стагоддзі суправаджалася з яе выкарыстаннем у палеміцы з каталікамі і пратэстантамі; сцвярджалася містычнае, “духоўнае” прачытанне Святога Пісьма ў супрацьвагу заходнім “сілагізмам”. Адначасова пэўныя аспекты тлумачэння Бібліі праваслаўнымі ўкараняліся ў тагачасны еўрапейскі духоўны і асветны кантэкст. Так, ужо з канца XVI стагоддзя ў праваслаўных брацкіх школах і Астрожскай школе, а з XVII стагоддзя ў Кіеўскім калегіуме (Акадэміі) зарадзіліся асновы выкладання біблейскіх ведаў [22, с. 17–30].

У XVIII – на пачатку XIX стагоддзя ў Кіева-Магілянскай акадэміі быў назапашаны значны корпус біблейскай літаратуры – біблейскіх тэкстаў і каментараў. Там быў рэпрэзентаваны еўрапейскі досвед засваення Бібліі. Гэтая літаратура стала асновай біблейскіх штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя. Шэраг выдатных прадстаўнікоў Кіева-Магілянскай акадэміі прадэманстравалі характэрныя для свайго часу еўрапейскія паводле сваёй сутнасці трансфармацыі ў даследаванні Бібліі. Ужо тады адбываўся пераход ад арыентацыі на тлумачэнні святых айцоў да прачытання бібліі скрозь прызму навукі: тэкстуальнай, філалагічнай, літаратурнай, гістарычнай крытыкі. Нараджаліся біблейска-гебраісцкія штудыі, біблейска-перакладчыцкая справа, акадэмічнае выкладанне біблейскіх ведаў на падставе навукова абгрунтаваных практыкаванняў з галіны герменеўтыкі і экзагезы [25, с. 100–107].

**Бібліялагічная адукацыя ў Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя.** Эвалюцыя выкладання ведаў пра Біблію ў Кіеўскай духоўнай акадэміі на працягу XIX – пачатку XX стагоддзя адбывалася пад адміністрацыйным і дыдактычным уздзеяннем так званых акадэмічных Статутаў 1814, 1869, 1884, 1910 гадоў, якія рэгулявалі развіццё багаслоўскай адукацыі. На працягу XIX стагоддзя мела месца паступовая сістэматызацыя і дысцыплінарная дыферэнцыяцыя біблейскай адукацыі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі. Вылучыліся такія прадметы: “Святое Пісьмо Старога Запавету”; “Святое Пісьмо Новага Запавету”; “Біблейская гісторыя”; “Яўрэйская мова і біблейская археалогія”, якія ў сваю чаргу падзяляліся на “абавязковыя” і “спецыяльныя” або “групавыя”. Пераемнасць у выкладанні гэтых прадметаў

забяспечвалася прадстаўнікамі некалькіх пакаленняў акадэмічнай прафесуры. У 1860–1880-я гады тут выкладала плеяда выхаванцаў Кіеўскай духоўнай акадэміі: Стэфан Сольскі, Якім Алясніцкі, Арсеній Царэўскі, Фёдар Пакроўскі, Уладзімір Рыбінскі, Дзмітрый Багдашэўскі, пратаіерэй Аляксандр Глаголеў. На пачатку XX стагоддзя ў адпаведнасці з акадэмічным Статутам 1910 года, былі заснаваныя дадатковыя кафедры Старога і Новага Запавету і да працы далучыліся новыя выкладчыкі: Міхаіл Пасноў, Віктар Іваніцкі, Рыгор Паповіч, Міхаіл Смірноў, Мікалай Бесарабаў. Статус Кіеўскай духоўнай акадэміі як установы царкоўнай адукацыі вызначыў дамінаванне апалагетычных задач і ўстановак у выкладанні Бібліі. Асабліва гэта выявілася ў патрабаванях да пісьмовых прац студэнтаў Кіеўскай духоўнай акадэміі на біблейскую тэматыку. Найбольш актуальнымі напрамкамі тэарэтычных пошукаў прафесараў Кіеўскай духоўнай акадэміі ў сферы выкладання Бібліі былі "павышэнне якасці ісагагічных (прапедэўтычных) прадмоваў", "стварэнне школьнай тлумачальнай Бібліі", "паляпшэнне ўзроўню выкладання Бібліі", асабліва біблейскіх моў, у праваслаўных біблейскіх школах. Кіеўскія бібліязнаўцы таксама сфармулявалі асноўныя патрабаванні да выкладання ведаў пра Біблію, стварылі ўзор ідэальнага апалагетычнага падручніка па біблейскай гісторыі з увядзеннем у навучальны працэс богаслужэбна-дыдактычных распрацовак заходніх біблеістаў-апалагетаў [21, с. 76–83; 22, с. 81–107, 119–139].

Працэс выкладання арыгінальных біблейскіх моў (старажытнаяўрэйскай і грэчаскай) быў важным фактарам развіцця бібліязнаўства ў Кіеўскай духоўнай акадэміі. Тут яшчэ з "магілянскіх часоў" [39] склалася адна з найбольш старажытных традыцый айчыннай праваслаўнай гебрыістыкі (Іван Максімовіч, Мікалай Гуляеў, Якім Алясніцкі, протаіерэй Аляксандр Глаголеў). У Кіеўскай духоўнай акадэміі планамерна адбывалася аб'яднанне вывучэння старажытнаяўрэйскай мовы з вывучэннем біблейскай археалогіі. Гэтым самым выкладчыкі стваралі гісторыка-лінгвістычны фундамент для вывучэння біблейскіх старажытнасцяў, а біблейская мова засвойвалася неадрыўна ад свайго культурнага кантэксту [7; 40; 41].

Пытанне пра сістэматычнае вывучэнне ў праваслаўных духоўных навучальных установах старажытнаяўрэйскай і грэчаскай моў як "біблейскіх" было актуальным на працягу ўсяго XIX стагоддзя. Яшчэ адной праблемай стала ўспрыманне праваслаўнымі еўрапейскіх здабыткаў у галіне даследавання біблейскіх тэкстаў і метадалогіі перакладчыцкай працы. У прыватнасці, гэта азначала выкарыстанне яўрэйскага «масарэцкага» тэксту побач з Септуагінтай для праваслаўных перакладаў Бібліі і праваслаўнай экзагезы [15, с. 56–64].

Важным і спецыфічным для Кіеўскай духоўнай акадэміі стала асэнсаванне праблем папулярнага прадстаўлення Бібліі, у прыватнасці ў школе і ў місіянерскай дзейнасці (Фёдар Пакроўскі, протаіерэй Аляксандр Глаголеў, Уладзімір Рыбінскі) [8; 11; 51; 53]. Абагульняючы замежны досвед папулярызацыі Бібліі, кіеўскія прафесары адмаўлялі рацыяналістычна-крытычную інтэрпрэтацыю. Але адначасова яны станоўча ўспрымалі выкарыстанне дапаможных "тэхнічных" сродкаў вывучэння Бібліі. "Школьная" папулярызацыя Бібліі павінна была стаць сродкам пераадолення рэлігійнага індэферэнтызму і прыладай праваслаўнай апалагетыкі [20, с. 44–50].

Крытычнае ж асэнсаванне на пачатку XX стагоддзя досведу выкарыстання Бібліі ў праваслаўным місіянерстве і міжканфесійнай палеміцы (Уладзімір Рыбінскі) прыводзіла да высновы, што якасная папулярызацыя Бібліі неаддзельная ад яе навуковага даследавання. Разам з тым існавала складанасць узгаднення акадэмічнага засваення Бібліі з яе місіянерскай і палемічнай прэзентацыяй, паколькі правядзенне навуковых працэдур аналізу і рацыяналізаваных правіл біблейскай экзагезы мусіла спалучацца са спрашчэннем і ўніфікацыяй біблейскіх тлумачэнняў дзеля сцвярджэння царкоўных дагматаў і культу сярод малаадукаванага народу [24, с. 23–31].

**Бібліязнаўчыя штудыі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі ў XIX – на пачатку XX стагоддзя: еўрапейскі і айчынны кантэксты.** Аналіз публікацый прафесараў Кіеўскай духоўнай акадэміі – даследчыкаў Бібліі – паказвае, што іх навуковая дзейнасць тут адбывалася пад уплывам розных культурных і ідэалагічных фактараў. Пазітыўным момантам было паступовае ўмацаванне багаслоўскай адукацыі, развіццё навукова-выдавецкай дзейнасці і багаслоўскай перыёдыкі. Негатыўны ўплыў мела ідэалагічная цэнзура.

У Кіеўскай духоўнай акадэміі спачатку актуальнымі напрамкамі дзейнасці былі: пераклады Бібліі і патрыстычных каментараў да яе, палеаграфічныя, тэксталагічныя і філалагічныя пошукі, даследаванні ў сферы розных бібліялагічных дысцыплін і напрамкаў. Таму акцэнт на філалагічнай апрацоўцы бібліі, выкарыстанне Масарэцкага тэксту і яго аўтарскіх перакладаў сталі выразнай "лакальнай" асаблівасцю вучэбных лекцый і даследчыцкіх прац.

Паступова развіваліся такія напрамкі даследаванняў, як біблейская ісагогіка, біблейская экзагеза, біблейская археалогія і культура; кампаратыўнае вывучэнне біблейскай традыцыі ў кантэксце старажытных культур; вывучэнне біблейскіх апокрыфаў; гістарычная і літаратурная крытыка Бібліі. Пачалося асэнсаванне бібліязнаўчых даследаванняў як сферы ўзаемадзеянняў навуковых і рэлігійных ведаў, якое адбывалася на глебе крытычна-апалагетычнага засваення дадзеных заходняй біблейскай навукі.

Развівалася прафесійная навуковая камунікацыя. Яе характэрнай формай стала магутная традыцыя бібліяграфічнай крытыкі: агляды, рэцэнзіі, прысвечаныя творам іншаземных і расійскіх біблеістаў. Дру-

гой формай быў удзел выдатных прафесароў-біблеістаў Кіеўскай духоўнай акадэміі ва ўсерасійскіх навукова-багаслоўскіх праектах, перадусім ва ўкладанні “Тлумачальнай Бібліі Лапухіна” і “Праваслаўнай багаслоўскай Энцыклапедыі”. Прыкметным быў унёсак не толькі штатных выкладчыкаў Бібліі, але і шматлікіх выкладчыкаў і выхаванцаў Кіеўскай духоўнай акадэміі, якія спалучалі свае біблейскія штудыі з працай у іншых галінах багаслоўя ці царкоўнай гісторыі [14, с. 51–60].

Адным з ключавых аспектаў праваслаўных біблейскіх штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі сталі даследаванні царкоўнаславянскага тэксту Бібліі як крыніцы айчыннай літургічнай традыцыі і індыкатара аўтэнтычнасці расійскіх біблейскіх перакладаў. Гэтыя даследаванні спалучаліся з развіццём тэхнік супастаўлення і аналізу рукапісных традыцый і старадрукаў, метадаў тэксталагічнага, лінгвістычнага, літаратурнага аналізу. Распрацоўку дадзенай тэматыкі стымулявалі конкурсы навуковых прац і адпаведныя прэміі (напрыклад, Макараўская і Іосіфаўская). Сярод “лакальных” здабыткаў дадзенага навуковага напрамку неабходна адзначыць даследаванні гісторыі Астрожскай Бібліі (Стэфан Сольскі) і рукапісных славянскіх Евангелляў з кіеўскіх кнігасховішчаў (Рыгор Крыжаноўскі) [32; 58]. Гэтыя працы атрымалі істотнае значэнне дзякуючы асабліваму статусу кіеўскай культуры ў захаванні і трансляцыі багаслоўскага і літургічнага досведу праваслаўнай Царквы ў славянскім свеце [23, с. 121–130].

Спецыялісты з Кіеўскай духоўнай акадэміі на працягу XIX стагоддзя прымалі ўдзел у выпрацоўцы расійскага перакладу Бібліі. Размова ідзе перадусім пра працу пад эгідай Расійскага біблейскага таварыства і падчас падрыхтоўкі так званага Сінадальнага перакладу (Іван Максімовіч, Мікалай Гуляеў, епіскап Парфірый (Успенскі), Якім Алясніцкі) [гл., напр.: 26; 34; 52]. Кіеўскія выкладчыкі зрабілі таксама ўнёсак і ў стварэнне герменеўтычнай праграмы інтэрпрэтацыі Сінадальнага перакладу. Такім чынам, была пачатая традыцыя расійскіх “тлумачальных Біблій”. Ключавымі ў іх сталі правілы ўнясення тлумачальных заўваг да расійскага тэксту павучальных кніг Старога Запавету 1877 года (Якім Алясніцкі) [44]. Папулярнае тлумачэнне Сінадальнага перакладу атрымлівалася шляхам выкарыстання лінгвістычнага аналізу, звароту да гістарычнага і культурнага кантэксту біблейскіх апавяданняў. Гэтая праца спрыяла прымнажэнню ў Кіеўскай духоўнай акадэміі каштоўнага герменеўтычнага досведу прымянення навуковых дадзеных адпаведна да патрэб праваслаўнай экзэгезы. Такі досвед быў карысны для праваслаўнай біблейскай адукацыі, асветы, місіянерства. Можна меркаваць, што пад уплывам “правіл” Алясніцкага напрыканцы XIX – на пачатку XX стагоддзя адбываліся і дыскусіі аб выкладанні Святога Пісьма і яго выкарыстанні ў місіянерскіх практыках, і спробы стварэння “школьнай Бібліі”, і з’яўленне “тлумачальнай Бібліі Лапухіна” [17, с. 56–63].

Спецыфічнымі былі таксама кантакты праваслаўных даследчыкаў XIX – пачатку XX стагоддзя з заходняй біблейскай навукай, асабліва з яе рацыяналістычнымі і ліберальнымі накірункамі. Гэтыя кантакты вызначаліся, з аднаго боку, патрэбамі ў развіцці навуковых дасягненняў Захаду, а з другога – патрэбай апалогіі праваслаўнага вучэння перад заходняй “негатыўнай” біблейскай крытыкай.

У 1860–1870-я гады для Кіеўскай духоўнай акадэміі былі актуальнымі стратэгіі аналізу і абвяржэння “негатыўнай” біблейскай крытыкі [37, с. 142–148], гісторыка-багаслоўскай ацэнкі рацыяналістычных трансфармацый у еўрапейскіх біблейскіх даследаваннях Новага часу (С.М. Сольскі) [54, с. 497–502; 56, с. 598–599; 57, с. 249, 271–275; 59, с. 363]. Істотнае значэнне мела апалагетычна арыентаванае супастаўленне тэалагічнага і навуковага падыходаў. З 1880-х гадоў бібліязнаўчая паленіка з заходнімі даследчыкамі праводзілася ў Кіеўскай духоўнай акадэміі пераважна па наступных пытаннях: выкарыстанне гістарычнага эвалюцыянізму і гістарычнай крытыкі для аналізу генэзісу, аўтарства і дакладнасці біблейскіх кніг; магчымасць рацыянальнай праверкі біблейскіх пасланняў дадзенымі канкрэтных навук. Кіеўскія даследчыкі пастаянна знаходзілі ў заходніх творах прыклады барацьбы “спірытулістычных” і “натуралістычна-крытычных” поглядаў на біблейскую гісторыю, прыклады “традыцыйна-апалагетычнага супраціўлення”, накіраванага супраць рацыяналістычных тэорый. Еўрапейскіх бібліязнаўцаў апалагетычнага накірунку лічылі аб’ектыўнымі саюзнікамі праваслаўных. Дыскусія з іншавернымі канцэпцыямі, асабліва радыкальнымі, стала неад’емнай часткай развіцця біблейскай навукі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі. Яна спрыяла засваенню навуковых герменеўтычных і даследчыцкіх прыёмаў, прыцягненню да комплекснага вывучэння Бібліі гісторыі, археалогіі, палеаграфіі, лінгвістыкі, літаратуразнаўства і г.д. [67, S. 191–200].

**Праблемнае поле кіеўскага духоўна-акадэмічнага бібліязнаўства XIX – пачатку XX стагоддзя: прыклады персанальнай рэпрэзентацыі.** Намі быў спецыяльна прааналізаваны ўнёсак шэрагу выдатных прафесараў Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя да біблейскіх штудый у акадэміі. У даследаваннях гэтых навукоўцаў сцвярджалася ідэнтычнасць праваслаўных біблейскіх штудый, адбывалася прагрэсіўнае супастаўленне багаслоўскай і навуковай парадыгмаў мыслення, ствараліся новыя метадалагічныя сінтэзы, па-новаму ўсведамлялася эўрыстычная каштоўнасць традыцыйнай праваслаўнай спадчыны.

Так, менавіта ў Кіеўскай духоўнай акадэміі ўпершыню была сфармулявана задача стварэння праваслаўнай ісагагічнай прапедэўтыкі і былі прапанаваны шляхі яе вырашэння на годным навуковым узроўні (Стэфан Сольскі) [59, с. 358–376]. Асноўным прынцыпам быў не толькі гістарычны, але і

дагматычны падыход, здольны абараніць ад рацыяналістычнай крытыкі святасць Бібліі. Царкоўнае паданне разглядалася як гістарычная крыніца для доказу аўтэнтычнасці біблейскага тэксту, а гістарычная крытыка Бібліі знаходзіла апалагетычныя аргументы для абгрунтавання сведчанняў царкоўнай традыцыі [18, с. 95–109]. Такія ўстаноўкі пераклікаліся з інтэнцыямі іншых кіеўскіх даследчыкаў Бібліі. Напрыклад, яны рэалізоўваліся ў лекцыях па Новым Запавеце вядомага даследчыка – вучня і пераемніка Сольскага Дзмітрыя Багдашэўскага [гл. 3].

Своеасабліва былі прадстаўлены ў Кіеўскай духоўнай акадэміі такія прадметы, як біблейская археалогія, вывучэнне старажытнай біблейскай культуры, яе параўнальны аналіз з іншымі культурамі. Працы шматлікіх кіеўскіх даследчыкаў прадэманстравалі засваенне першаснага археалагічнага матэрыялу, самастойныя спробы гістарычных рэканструкцый, ініцыяваныя археалагічнымі знаходкамі на Блізкім Усходзе на працягу ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя. Тыпова “кіеўскай” рысай з’яўлялася эвалюцыя ад эмпірычнага апісання да тэарэтычных абагульненняў, канкрэтызацыя метадалагічных прынцыпаў і патрабаванняў да біблейскай археалогіі як навукі. Гэтая эвалюцыя была ўвасоблена ў біблейска-археалагічных пошуках Якіма Алясніцкага [43; 48; 49; 50]. У выніку спалучэння рэцэпцыі здабыткаў тагачаснай сусветнай біблейскай археалогіі з уласным даследчыцкім досведам ён стаў адным з першых у Расійскай імперыі спецыялістаў у дадзенай навуковай дысцыпліне. Асобная ўвага належыць творам даследчыка [45; 46], у якіх адлюстроўваліся яго асабістая метадалогія, герменеўтыка, вырашэнне канкрэтных пазнавальных задач, у прыватнасці даследаванні і ацэнкі аўтэнтычнасці археалагічных знаходак, што прэтэндуюць на ролю артэфактаў біблейскай гісторыі [19, с. 73–80]. Развіццё ў Кіеўскай духоўнай акадэміі археалогіі, ініцыяванае замежнымі і ўласнымі здабыткамі, адбывалася ва ўмовах аб’ектыўнага ўзаемадзеяння яе апалагетычнага і навуковага аспектаў.

На працягу ХІХ стагоддзя ў Кіеўскай духоўнай акадэміі актуальнымі сталі пытанні тэкстуальнай, філалагічнай і літаратурнай крытыкі Бібліі. Этапнымі ў станаўленні кіеўскай праваслаўнай біблейскай тэксталогіі сталі персанальныя спробы крытычнага разгляду гісторыі агульнапрынятага старажытнаяўрэйскага тэксту (Якім Алясніцкі) [47]. Яны грунтаваліся на гістарычным падыходзе, на аналізе інтэлектуальнага і рэлігійнага кантэксту, на дэманстрацыі канструктыўных з філалагічнага і гістарычнага пункту гледжання аспектаў параўнання розных тэкстуальных традыцый. Яскравым стаў таксама аналіз Я. Алясніцкім старажытнаяўрэйскай старазапаветнай паэзіі [42]. Пытанне пра бібілейскую літаратурную форму набыло тут першачарговае герменеўтычнае значэнне, а герменеўтыка біблейскай паэтыкі атрымала дагматычны сэнс. Алясніцкі прапаноўваў канструктыўнае прыняцце рэсурсаў лінгвістыкі і літаратуразнаўства для даследавання Бібліі. Даследчык крытычна асэнсаваў папярэдні досвед пастаноўкі і вырашэння праблемы вызначэння спецыфікі біблейскай паэзіі, пабудаваў уласную канцэпцыю старазапаветнай паэтыкі, абгрунтаваў навуковую і багаслоўскую значнасць старажытнаяўрэйскага тэксту Бібліі. Якім Алясніцкі ўвасабляў у сабе ўнікальны досвед выкарыстання тэкстуальнай, філалагічнай і літаратурнай крытыкі Бібліі для аналізу канкрэтных старазапаветных кніг і старазапаветнай паэтыкі ў цэлым. Гэты досвед стаў узорным для айчыннага багаслоўя і біблейскіх штудый.

Напрыканцы ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя ў Кіеўскай духоўнай акадэміі паўстала магутная своеасаблівая “кіеўская версія” праваслаўнай біблейскай апалагетыкі. Вядомыя прафесары – даследчыкі Бібліі, разглядаючы розныя пытанні яе паходжання і гістарычнасці, абгрунтоўвалі звышнатуралістычнае, тэлеалагічнае, правідэнцыяльнае бачанне гістарычнага працэсу, гістарычнасць біблейскіх апавяданняў, адзінства Старога і Новага Запаветаў (Фёдар Пакроўскі, Уладзімір Рыбінскі, протаіерэй Аляксандр Глаголеў, Дзмітрый Багдашэўскі) [2; 3; 6; 8; 11; 51; 53]. Своеасаблівасць “кіеўскай версіі” біблейскай апалагетыкі вызначалася перадусім агульнавядомымі ў тагачаснай Расійскай імперыі пытаннямі і выклікамі (супрацьстаянне “баўра-вельгаўзенаўскай” школе “негатыўнай крытыкі”; “крытычныя выступы” Л.М. Талстога). Аднак існавала і кіеўская спецыфіка: біблейскае асэнсаванне “яўрэйскага пытання” або “дэпалітызацыя” дагматычных пытанняў [9; 11, с. 362–364]. Яскравай асаблівасцю кіеўскай біблейскай апалагетыкі была таксама інтэнцыя да вырашэння не толькі багаслоўскіх, але і навучальна-дыдактычных і ідэйна-асветніцкіх задач. Апалагетычны матыў павінен быў вызначаць і навуковыя даследаванні, і школьнае навучанне Бібліі, і маральна-выхаваўчае яе выкарыстанне.

Адначасова на пачатку ХХ стагоддзя праваслаўная біблейская апалагетыка была цесна звязаная з навуковым мысленнем і даследаваннем. Так, прызнанне гістарычнага развіцця рэлігійнасці ў людзей рабіла магчымым выкарыстанне кампаратыўнага падыходу; апраўдвалася ўжыванне актуальнага навуковага матэрыялу для вырашэння канкрэтных даследчыцкіх задач дзеля пазбягання спекуляцый. Пошукі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі эфектыўнага ўзаемадзеяння навукі і багаслоўя на біблейскай глебе сведчылі пра станаўленне перспектыўнай герменеўтычнай стратэгіі, актуальнай для развіцця праваслаўнай біблейскай навукі ў наш час.

**Заключэнне.** На аснове вывучэння твораў кіеўскіх выкладчыкаў-бібліязнаўцаў, а таксама ўпершыню ўведзеных у навуковы зварот інстытуцыйных і навучальна-метадычных дакументаў Кіеўскай духоўнай акадэміі праведзена рэканструкцыя сістэмы бібліязнаўчай адукацыі ў Кіеўскай духоўнай акадэміі.

Выяўлена, што галоўнай прыкметай яе інстытуцыйнага афармлення стаў прадметна-дысцыплінарны падзел паміж кафедрамі Святога Пісьма Старога і Новага Запавету, біблейскай гісторыі, біблейскай археалогіі і старажытнаяўрэйскай мовы, які карэляваў са зместам такіх даследчыцкіх накірункаў, як біблейская ісагогіка, біблейская археалогія і культура, біблейская тэксталогія, даследаванні біблейскіх моў і перакладаў, гістарычная і літаратурная крытыка Бібліі, біблейская экзагеза і багаслоўе.

Сістэматычны аналіз дыдактычнага тэарэтызавання выбітных кіеўскіх выкладчыкаў-бібліязнаўцаў дазволіў выявіць, што іх пошукі і намаганні былі накіраваны на ўзмацненне ролі вывучэння Бібліі ў багаслоўскай адукацыі, павышэнне якасці вывучэння біблейскіх моў і стварэнне ўзорных бібліязнаўчых падручнікаў. Пры гэтым дыдактычныя падыходы азначаных бібліязнаўцаў грунтаваліся на абароне аўтэнтычнасці, дакладнасці, цэласнасці біблейскага тэксту адпаведна задачам царкоўнай багаслоўскай адукацыі, катэхізацыі, місіянерства і выхавання.

Вызначаная ў ходзе даследавання прадметна-тэматычная структура бібліязнаўчых штудый у Кіеўскай духоўнай акадэміі XIX – пачатку XX стагоддзя ўключала ў сябе пераклады Бібліі, даследаванні ў галіне біблейскай ісагогікі, экзагезы і багаслоўя, вывучэнне біблейскай гісторыі і археалогіі, даследаванне біблейскай апокрыфікі, тэксталагічную, філалагічную, літаратурную і гістарычную крытыкі Бібліі. Значныя навуковыя вынікі штудый кіеўскіх выкладчыкаў былі адлюстраваны ў тэксталагічнай і філалагічнай апрацоўцы Бібліі (крытычнае параўнанне царкоўнаславянскага і масарэцкага тэкстаў, навуковае і навучальнае выкарыстанне аўтарскіх біблейскіх перакладаў), у біблейскай археалогіі (эвалюцыя ад апісання першаснага эмпірычнага матэрыялу да гісторыка-культурных рэканструкцый і тэарэтычных абагульненняў), у біблейскай ісагогіцы (абгрунтаванне праваслаўных ісагагічных лекцый на аснове ўзаемадзеяння гістарычнага і дагматычнага падыходаў), у літаратурнай крытыцы Бібліі (канструктыўнае выкарыстанне здабыткаў тагачаснага мова- і літаратуразнаўства для аналізу старажытнаяўрэйскай старазапаветнай паэтыкі), у біблейскай герменеўтыцы і экзагезе (тлумачэнне расійскага Сінадальнага перакладу шляхам моўнага і гісторыка-культурнага аналізу).

Эўрыстычная і метадалагічная каштоўнасць парадыгмы бібліязнаўчых даследаванняў, што склалася ў Кіеўскай духоўнай акадэміі на працягу XIX – пачатку XX стагоддзя, палягала ў крытычным засваенні замежных крыніц, у прыцягненні актуальных навуковых дадзеных, даследчыцкіх падыходаў і тэхнік, у імкненні да балансу паміж адданасцю дагматычнай традыцыі і захаванні патрабаванняў навуковай рацыянальнасці; пры гэтым выяўлена, што асноўны вектар развіцця праваслаўнага бібліязнаўства ў Кіеўскай духоўнай акадэміі вызначаўся і карэктаваўся царкоўна-апалагетычнымі запытамі адносна даследчыцкага пошуку і канфесійнай спецыфікай навучальнай установы.

Спецыфіка засваення кіеўскімі выкладчыкамі дасягненняў сусветнага бібліязнаўства, абумоўленая ідэйна-канфесійнымі задачамі духоўнай акадэміі, палягала ў даследчыцка-дыдактычнай рэцэпцыі прац іншаземных даследчыкаў-“артадоксаў” і адмаўленні рацыяналістычнай біблейскай крытыкі шляхам абароны традыцыйнай атрыбутыкі і аўтэнтычнасці біблейскіх тэкстаў, параўнання іх літаральнага і сімвалічнага тлумачэння, вызначэння пазнавальных магчымасцей і межаў іх гістарычнай інтэрпрэтацыі. Крытыка рацыяналізму ажыццяўлялася кіеўскімі выкладчыкамі на аснове прынцыпаў сакральнасці Бібліі, гістарычна-дагматычнага адзінства Пісання і Падання, зверхнатуралізму і правідэнцыялізму. Адначасова прызнанне імі эвалюцыі рэлігійнасці чалавецтва, абумовіла магчымасць выкарыстання гістарычнага і кампаратыўнага падыходаў, спрыяючы зараджэнню ў Кіеўскай духоўнай акадэміі элементаў “протарэлігіязнаўства” на падставе біблейскіх даследаванняў.

Папулярызацыя ведаў пра Біблію ў Кіеўскай духоўнай акадэміі напрыканцы XIX – пачатку XX стагоддзя адбывалася шляхам стварэння правіл папулярных біблейскіх тлумачэнняў, праектаў “школьных Біблій”, публічнай прапаганды грамадскага значэння і маральнай каштоўнасці Святога Пісьма, распрацоўкі методык прымянення Бібліі ў катэхітычнай і місіянерскай працы. Пры гэтым выявіўся супярэчлівы характар узгаднення кіеўскімі бібліязнаўцамі акадэмічнага засваення Бібліі з яе канфесійна адаптаванай да масавай рэлігійнай свядомасці прэзентацыі ў практыках катэхізацыі, міжканфесійнай палемікі і місіянерства.

Усё гэта сведчыць пра наяўнасць сфарміраванай на працягу XIX – пачатку XX стагоддзя традыцыі духоўна-акадэмічнага бібліязнаўства, адлюстраванай у дзейнасці цэласнай даследчыцка-выкладчыцкай супольнасці, аб’яднанай адзінай камунікатыўнай прасторай, пераемнасцю катэгарыяльнага апарату і герменеўтычных прынцыпаў бібліязнаўчых ведаў, іх “школьным” характарам, дысцыплінарна забяспечаным за “кафедрамі” навучаннем, рэтрансляцыйнай сувяззю “настаўніцтва – вучнёўства”, крытычнай рэцэпцыяй дасягненняў іншых бібліязнаўчых традыцый.

ЛІТАРАТУРА

1. Алексий (Макринов), иером. Вклад Санкт-Петербургской (Ленинградской) духовной академии в развитие библеистики // Богословские труды. – М., 1986. – С. 199–210.

2. Богдашевский, Д.И. О Евангельских чудесах (Заметка против рационалистов и в частности против графа Л. Толстого) / Д.И. Богдашевский // ТКДА. – 1900. – № 8. – С. 473–493.
3. Богдашевский, Д.И. О Евангелиях и евангельской истории (против современного рационализма). Публичное чтение / Д.И. Богдашевский // ТКДА. – 1902. – № 2. – С. 269–302.
4. Богдашевский, Д.И. Речь у гроба почившаго профессора Киевской Духовной Академии А.А. Олесницкаго / Д.И. Богдашевский // ТКДА. – 1907. – № 10. – С. 330–334.
5. [Богдашевский Д.И.] Конспекты лекций по Новому завету, прочитанных профессором КДА Богдашевским Дмитрием Ивановичем 1907/08 уч. г. Стеклограф [Рукопис]. – Інститут рукопису Національної бібліотеки України ім. В.І. Вернадського. – Фонд 191. – № 63. – 186 арк.
6. Богдашевский, Д.И. Исторический характер книги Деяний Апостольских / Д.И. Богдашевский // ТКДА. – 1909. – № 11. – С. 381–425.
7. Глаголев Александр Александрович. Библейская археология. Распространенная программа и часть конспектов – студентов II курса. 1900/01, 1902/03 уч. гг. [Рукопис]. – Інститут рукопису Національної бібліотеки України ім. В. І. Вернадського. – Фонд 160. – № 15661.
8. Глаголев А.А., свящ. Непреходящее значение Ветхого Завета. Библиологическая заметка на: Die bleibende Bedeutung des Alten Testaments, von *Emil Kautzsch*, Tübingen und Leipzig, 1902. § 38 // ТКДА. – 1902. – № 11. – С. 491–504.
9. Глаголев А.А., свящ. Сионистское движение в современном еврействе и отношение этого движения к всемирно-исторической задаче библейского Израиля / А.А. Глаголев // ТКДА. – 1905. – № 4. – С. 513–565.
10. Глаголев А.А., свящ. Слово на заупокойной литургии при погребении заслуженного профессора Киевской Духовной Академии Акима Алексеевича Олесницкаго (3 сентября 1907 г.) / А.А. Глаголев // ТКДА. – 1907. – № 10. – С. 323–329.
11. Глаголев А.А., свящ. Ветхий Завет и его непреходящее значение в христианской Церкви / А.А. Глаголев // ТКДА. – 1909. – № 11. – С. 353–380; № 12. – С. 517–550.
12. Глаголев, А.А., прот. К двадцатипятилетию академической службы проф. В.П. Рыбинского / А.А. Глаголев // ТКДА. – 1917. – Т. II, № III–VIII. – С. 254–260.
13. Глубоковский, Н.Н. Русская богословская наука в ее историческом развитии и новейшем состоянии / Н.Н. Глубоковский. – Варшава, 1928. – М., 2002.
14. Головащенко, С.І. Біблеїстична проблематика в Академії у 1861–1914 рр. / С.І. Головащенко // Наукові записки НаУКМА. – К., 2004. – Т. 35. – С. 51–60.
15. Головащенко, С.І. Викладання й вивчення біблійних мов у Київській духовній академії: культурно-конфесійні та ідеологічні обставини / С.І. Головащенко // Маґістеріум. – К., 2004. – Вип. 13. – С. 56–64.
16. Головащенко, С. Книжні джерела для вивчення Біблії в Київській академії: кілька міркувань що до контекстуальної реконструкції / Сергій Головащенко // Київська Академія. – К., 2006. – Вип. 2–3. – С. 229–236.
17. Головащенко, С.І. Правила для руководства при составлении объяснительных примечаний к русскому тексту Библии Я.О. Олесницького: передісторія російської тлумачної Біблії / С.І. Головащенко // Наукові записки НаУКМА. – К., 2006. – Т. 50. – С. 56–63.
18. Головащенко, С.І. Про деякі аспекти бібліологічної спадщини С.М. Сольського: біблійна ісагогіка / С.І. Головащенко // Київська Академія. – К., 2007. – Вип. 4. – С. 95–109.
19. Головащенко, С. До питання про становлення в Київській духовній академії біблійної археології як науки: досвід Я.О. Олесницького / Сергій Головащенко // Київська Академія. – К., 2008. – Вип. 5. – С. 73–80.
20. Головащенко, С.І. Біблія як предмет популярного вивчення: київська візія кінця XIX – початку XX ст. / С.І. Головащенко // Київська Академія. – К., 2010. – Вип. 8. – С. 44–50.
21. Головащенко, С.І. Студентські твори з бібліології в Київській духовній академії кінця XIX – початку XX ст.: вимоги та критерії оцінювання / С.І. Головащенко // Наукові записки НаУКМА. – К., 2011. – Т. 115. – С. 76–83.
22. Головащенко, С.І. Дослідження та викладання Біблії в Київській духовній академії XIX – початку XX ст.: моногр. / С.І. Головащенко. – К., 2012. – 356 с.
23. Головащенко, С.И. Славянская Библия в Киевской духовной академии: присутствие текстов и проблема исследования / С.И. Головащенко // Труди Київської Духовної Академії. – К., 2012. – № 16. – С. 121–130.
24. Головащенко, С.І. Між академічним вивченням і місіонерською популяризацією Біблії: «особлива думка» професора Володимира Рибінського / С.І. Головащенко // Наукові зап. НаУКМА. – К., 2013. – Т. 141. – С. 23–31.

25. Головащенко, С.І. Про Роль «Могилянської доби» в становленні й розвитку київського духовно-академічного біблієзнавства / С.І. Головащенко // Труди Київської Духовної Академії. – К., 2013. – № 19. – С. 100–107.
26. [Гуляев Мих.] Исторические книги Священного Писания Ветхого Завета. Четыре книги Царств, две книги Паралипоменон, книга Ездри, книга Неемии и Эсфирь; пер. с евр. яз., с подстрочными примечаниями: филологическими, археологическими и историческими, и другими профессора Киевской Духовной Академии Михаила Гуляева. – К., 1866.
27. Елеонский, Ф.Г. Отечественные труды по изучению Библии в XIX веке / Ф.Г. Елеонский // Христианское чтение. – 1901. – Т. I. – С. 5–28, 633–660; 1902. – Т. I. – С. 39–64, 504–524; Т. II. – С. 107–125.
28. Жуковський, Арк. Вклад КДА та її «Трудів» на культурному та богословському відтинках / Арк. Жуковський // Хроніка 2000. – К., 2000. – Т. 1. – Вип. 37–38. – С. 482–499.
29. Ианнуарий (Ивлиев), архим. Библеистика в Русской Православной Церкви в XX в. // Православное богословие на пороге третьего тысячелетия: Богословская конференция РПЦ (Москва, 7–9 февр. 2000 г.): материалы. – М., 2000. – С. 30–38.
30. Карсим, І.А. Професор Степан Сольський: до історії біблійної школи Київської Духовної Академії 2-ї пол. XIX ст. / І.А. Карсим // Труди Київської Духовної Академії. – К., 2009. – № 11. – С. 36–47.
31. Корольков, И.Н. Преосвященный Филарет, еп. Рижский, как ректор КДА / И.Н. Корольков // ТКДА. – 1882. – № 12. – С. 1–96.
32. Крыжановский, Г.Я. Рукописные Евангелия Киевских книгохранилищ. Исследование языка и сравнительная характеристика / Г.Я. Крыжановский. – К., 1889.
33. Макар М., прот. Гебраїстика в Київській духовній академії та праці прот. Олександра Глаголєва / М. Макар // Магістеріум. – Вип. 9. – К., 2002. – С. 52–55.
34. [Максимович И.П.] Опыт переложения на русский язык священных книг Ветхого Завета проф. И.П. Максимовича (с еврейского текста). Книга Экклезиаста // Христианское Чтение. – СПб., 1861. – Т. 2. – № 4.
35. Малышевский, И.И. Историческая записка о состоянии академии в минувшее пятидесятилетие / И.И. Малышевский // ТКДА. – 1869. – № 11. – С. 64–138.
36. Мень А., прот. К истории русской православной библеистики / А. Мень // Богословские труды. – М., 1987. – Сб. 28. – С. 272–290.
37. Михаил (Лузин), еп. Библейская наука. Книга первая: Очерк истории толкования Библии. – Тула, 1898.
38. Никольский, М.В. Наша библейская наука / М.В. Никольский // Православное обозрение. – 1875. – Т. II. – № 2. – С. 184–196.
39. Нічик, В.М. Симон Тодорський і гебраїстика в Києво-Могилянській академії / В.М. Нічик. – К., 2002.
40. Олесницкий, А.А. [Олесницкий Аким Алексеевич]. Конспекты по библейской археологии [Рукопис]. – Інститут рукопису Національної бібліотеки України ім. В.І. Вернадського. – Фонд 160. – № 1790.
41. Олесницкий, А.А. Лекции проф. А.А. Олесницкого по еврейскому языку, читанные студентам словесного отделения I курса киевской академии 1888–9 академическом году, записанные студентом П. Кудрявцевым в четверть, на 57 стр. [Рукопис]. – Інститут рукопису Національної бібліотеки України ім. В.І. Вернадського. – ДА. – Фонд 811. – № 1794. – 57 арк.
42. Олесницкий, А.А. Ритм и метр ветхозаветной поэзии / А.А. Олесницкий // ТКДА. – 1872. – № 10. – С. 242–294; № 11. – С. 403–472; № 12. – С. 501–592.
43. Олесницкий, А.А. Святая Земля. Отчет по командировке в Палестину и прилегающие к ней страны. 1873–74 / А.А. Олесницкий. – Т. 1–2. – Киев, 1875–78.
44. [Олесницкий А.А.]. Правила для руководства при предполагаемом составлении в Киевской духовной Академии объяснительных примечаний к русскому тексту Библии (учительных книг), составленные, по поручению Совета Академии, экстраординарным профессором Ак. Олесницким // ТКДА. – 1877. – № 8. – Приложение. – С. 231–237.
45. Олесницкий, А.А. Вопрос о новейших открытиях моавитских древностей (с рисунками) / А.А. Олесницкий // ТКДА. – 1877. – № 10. – С. 2–78.
46. Олесницкий, А.А. О том, как доктор Сепп открыл древний храм Ваала Между Иерусалимом и Вифлеемом / А.А. Олесницкий // ТКДА. – 1878. – № 3. – С. 637–657.
47. Олесницкий, А.А. Тенденциозные корректуры иудейских книжников (соферимов) в чтении Ветхого Завета / А.А. Олесницкий // ТКДА. – 1879. – № 5. – С. 3–54.
48. Олесницкий, А.А. По вопросу о раскопках 1883 г. на русском месте в Иерусалиме / А.А. Олесницкий // Записки Императ. Рус. археологич. общества. – СПб., 1887. – Т. 2. – С. 187–245.
49. Олесницкий, А.А. Ветхозаветный храм в Иерусалиме / А.А. Олесницкий. – СПб., 1889.
50. Олесницкий, А.А. Мегалитические памятники Святой Земли / А.А. Олесницкий. – СПб., 1895.

51. Покровський, Ф.Я. [Рецензія] / Ф.Я. Покровський // ТКДА. – 1894. – № 8. – С. 630–663; № 9. – С. 146–170. – Рец. на учебник библейской истории Ветхого Завета, доктора Августа Келера.
52. [Порфирий (Успенский), еп.] Книга Эсфири, переведена с греческой рукописи 6529–1021 года, хранящейся в библиотеке Афоно-Ватопедского монастыря, Порфирием, епископом Чигиринским // ТКДА. – 1874. – № 5. – С. 144–161.
53. Рыбинский, В.П. О Библии (Публичное чтение) / В.П. Рыбинский // ТКДА. – 1902. – № 3. – С. 359–382.
54. Сольский, С.М. Краткий очерк истории священной библиологии и экзегетики / С.М. Сольский // ТКДА. – 1866. – № 10. – С. 157–190; № 11. – С. 305–342; № 12. – С. 466–506.
55. Сольский, С.М. Обозрение трудов по изучению Библии в России с XV века до настоящего времени / С.М. Сольский // Православное обозрение. – 1869. – Т. 1, № 2. – С. 190–221; № 4. – С. 538–577; № 6. – С. 797–822.
56. Сольский, С.М. Из чтений по Ветхому Завету. Глава 1. История науки по Ветхому Завету и история происхождения Ветхозаветных книг / С.М. Сольский // ТКДА. – 1870. – № 9. – С. 589–640.
57. Сольский, С.М. Из лекций по Новому Завету / С.М. Сольский // ТКДА. – 1877. – № 8. – С. 234–284; 1878. – № 4. – С. 98–127.
58. Сольский, С.М. Острожская Библия в связи с целями и видами ея издателя / С.М. Сольский // ТКДА. – 1884. – № 7. – С. 293–320.
59. Сольский, С.М. Каков может быть состав научных введений в книги Священного Писания в настоящее время? / С.М. Сольский // ТКДА. – 1887. – № 3. – С. 358–376.
60. Строганов, В.С., прот. Вклад Московской Духовной Академии в герменевтику Нового Завета / В.С. Строганов // Журнал Московской Патриархии. – 1985. – № 8. – С. 75–79.
61. Титов, Ф.И., свящ. Стефан Михайлович Сольский (Некролог) / В.С. Строганов // ТКДА. – 1900. – № 12. – С. 629–640.
62. Титов Федор, проф. прот. Императорская Киевская Духовная Академия в ее трехвековой жизни и деятельности (1615–1915 гг.): Историческая записка. – К., 2003.
63. Ткачук, М.Л. «Академию бесконечно люблю…»: архиепископ Василий (Богдашевский) как студент, профессор и ректор Киевской духовной академии / М.Л. Ткачук // Труди Київської Духовної Академії. – К., 2012. – № 16. – С. 27–56.
64. Флоровский, Г.В., прот. Пути русского богословия / Г.В. Флоровский. – М., 2009.
65. Циганкова, Е.Г. Рибінський Володимир Петрович / Е.Г. Циганкова // Сходознавство і візантологія в Україні в іменах: біобібліограф. словник. – К., 2011. – С. 191.
66. Чистович, И.А. История перевода Библии на русский язык / И.А. Чистович. – СПб., 1899.
67. Gołowaszczenko S. Recepcia europejskiej krytyki biblijnej w Akademii Kijowskiej: wymiar hermeneutyczny a ideologiczny / Sergij Gołowaszczenko // ΣΟΦΙΑ. Pismo Filozofow Krajow Slowianskich. – Rzeszow, 2007. – Nr. 7/2007. – S. 191–200.

*Паступіў 17.05.2015*

## BIBLICAL STUDIES IN KIEV THEOLOGICAL AKADEMY XIX – EARLY XX CT.: INSTITUTIONAL STRUCTURES AND PERSONAL RESEARCH PRACTICES

***S. GOLOVASHCHENKO***

*This article presents a multiyear study undertaken by the author in a number of his research articles and monographs. For the first time in the Ukrainian academic studies, the historical and theoretical reconstruction of biblical studies at the Kyiv Theological Academy in the 19th and early 20th centuries has been accomplished. This phenomenon is demonstrated and reviewed as a holistic system of research, instructional, theological, apologetic, religious and educational activity. Personal representation of research and teaching practices has especially emphasized.*